Новы час

20.10.2018

# Ігнацый Дамейка: трыўмфальнае вяртанне на радзіму

Аляксей Харкевіч

Некалькі гадоў Пас Дамейка ішла сцежкамі свайго славутага продка па Літве, Польшчы, Беларусі, Францыі і Чылі. З пэўнага моманту ўсё яе жыццё праходзіць пад знакам Ігнацыя Дамейкі. Паўсюль Пас сустракае людзей, якія падпалі пад яго абаянне і бескарысліва дапамагаюць ёй выконваць яе місію. Ці таксама сваю?




*Каля помінку Ігнацыю Дамейка ля школы ў в. Малая Мядзвядка*

З 3 па 10 кастрычніка нашчадкі Ігнацыя Дамейкі — яго праўнучка Пас Дамейка з дачкой Паўлінай і ўнукамі Джэймсам і Нікам — знаходзіліся ў Беларусі. Спадарыня Пас мела намер прыехаць на радзіму продкаў інкогніта па шляху з Літвы, накіроўваючыся ў Польшчу і Нямеччыну, але потым пагадзілася з тым, што інфармацыю аб знаходжанні гасцей з Аўстраліі ў нашай краіне трэба зрабіць здабыткам галоснасці.

# Адысея-дамейкіяна

Дзяцінства і ранняе юнацтва Пас Дамейка прайшлі ў Аргенціне, Бразіліі, Чылі і Злучаных Штатах, бо бацька яе быў чылійскім дыпламатам. У шаснаццаць гадоў яна пераехала разам з сям'ёй у Сіднэй, дзе спадару Хуану Дамейка давялося заснаваць першую чылійскую місію і ўсталяваць дыпламатычныя і камерцыйныя адносіны з Аўстраліяй. Яго слава цяпер распаўсюджваецца нават на прапраўнукаў.



Пачатак, быццам бы, прыгожы, але жыццё Пас Дамейка — поўнае перыпетый, мабыць, нават занадта падрабязна выкладзеных у прадмове да беларускай версіі кнігі.

Вярнуўшыся ў Чылі, Пас Дамейка выйшла замуж, нарадзіла пецярых дачок. Працавала дырэктарам Чылійска-Паўночнаамерыканскага інстытута, выкладала ангельскую мову дарослым, праводзіла шматлікія культурныя мерапрыемствы ў горадзе Чыл'ян.

У 1971 годзе ў адрас спадарыні Дамейка і яе дачок сталі паступаць пагрозы ад прыхільнікаў камуністычнага ўрада Сальвадора Альендэ, які прыйшоў да ўлады, — білінгву Пас Дамейка многія чылійцы лічылі амерыканкай. Разам з сям'ёй яна была вымушаная, скарыстаўшыся дыпламатычнымі сувязямі бацькі, эміграваць у Аўстралію, дзе жыве да гэтага часу.




*Пас Дамейка і Вольга Раўчанка ў Новагрудскім замку*

Прапрацаваўшы некалькі гадоў у элітнай каталіцкай школе ў Сіднэі, Пас Дамейка знайшла сапраўднае прызванне ў індустрыі турызму, супрацоўнічаючы спачатку з авіякампаніямі Чылі, Бразіліі і Аргенціны, затым перайшоўшы ў турыстычнае агенцтва. Там незаўважна праляцела дваццаць гадоў. Працуючы ў авіякампаніях і турыстычных агенцтвах, Пас Дамейка выконвала сваю «цыганскую карму»: падарожнічала ўсё жыццё.

Некалькі гадоў таму, перамогшы сур'ёзнае захворванне, яна сур'ёзна задумалася аб сэнсе свайго існавання. Знаходзячыся ў стане клінічнай смерці, яна сустрэлася з Ігнацыем, які даў ёй зразумець, што яе місія на зямлі не скончана. Пайшоўшы пасля аперацыі на папраўку, яна прыйшла да высновы, што настае час кінуць працу і атрымліваць асалоду ад жыцця, даследуючы жыццё свайго продка, які менавіта на ёй спыніў свой выбар.




*Мемарыяльны камень у в. Малая Мядвядка*

Дачушкі сталі дарослымі і незалежнымі, так што Пас спакойна прынялася за жыццяпіс свайго прадзеда — Ігнацыя Дамейкі. Некалькі гадоў яна ішла яго сцежкамі па Літве, Польшчы, Беларусі, Францыі і Чылі — краіне, якая па волі лёсу стала для яго другой радзімай. Усё яе жыццё з таго часу праходзіць пад знакам Ігнацыя Дамейкі. Паўсюль Пас сустракае людзей, якія падпалі пад яго абаянне і бескарысліва дапамагаюць ёй выконваць яе місію. Ці таксама сваю?



*Святкаванне 220-годдзя Адама Міцкевіча ў Новагрудку*

У 1997 годзе яна ўпершыню інкогніта прыехала ў Беларусь. У паездцы яе суправаджалі юнак і дзяўчына, мінчукі. Кніга «Ignacio Domeyko: La Vida de Un Emigrante» выйшла ў Чылі на іспанскай мове ў 2002 годзе падчас сусветных урачыстасцяў, прысвечаных 200-годдзю з дня нараджэння Ігнацыя Дамейкі. Тады ж Пас Дамейка зноў наведала Беларусь. Назву кнізе даў выдавец насуперак таму, што Пас не лічыць свайго чылійскага продка эмігрантам: ён прыехаў працаваць па кантракце, і толькі непераадольныя абставіны перашкодзілі яму вярнуцца ў родны край.




Ангельская версія кнігі ўбачыла свет у Аўстраліі ў 2005 годзе, і ў яе іншая назва — «Ignacy Domeyko: A Life in Exile 1802-1889».

Абедзве кнігі прызначаліся, што ні кажы, замежнаму чытачу, як правіла, не знаёмаму ні з нашай гісторыяй, ні з нашымі рэаліямі. Больш за тое, спадарыня Пас ставіла мэту расказаць пра Ігнацыя Дамейку — чалавека, сем'яніна, хрысціяніна, калегу, выкладчыка; адлюстраваць найкаштоўнейшыя душэўныя якасці і маральныя прынцыпы героя. Гэта — папулярнае, а не навуковае выданне. Пас Дамейка не валодае беларускай, польскай, літоўскай мовамі, таму ёй даводзілася абыходзіцца перакладнымі крыніцамі.




З моманту выхаду кнігі Пас Дамейка працягвае падарожнічаць па свеце — з лекцыямі пра свойго дзіўнага продка ва ўніверсітэтах і іншых установах Злучаных Штатаў, Чылі, Літвы, Польшчы і Аўстраліі. Яе гутаркі адрозніваюцца дасканалым веданнем жыцця Ігнацыя Дамейка, якое яна прадстаўляе з гумарам, нефармальна і спантанна.

У 2016 годзе Пас Дамейка прапанавалі перавыдаць кнігу на іспанскай мове ў Чылі, і ёсць яшчэ надзея, што ў найбліжэйшай будучыні яна ўбачыць свет. Перагледжаны аўтарам рукапіс быў перакладзены на рускую мову. Пераклад, у сваю чаргу, пераклалі на беларускую.




Прэзентацыя кнігі «Ігнат Дамейка: з Мядзвядкі — у Сант'яга-дэ-Чылі» адбылася ў Мінску, у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь, 31 ліпеня 2017 года, у рамках урачыстасцяў, прысвечаных 215-годдзю Ігнацыя Дамейкі, якія праходзілі ў Беларусі і Літве. Назву кнізе даў перакладчык рукапісу на рускую мову, «каб надзейна прывязаць героя да мясцовасці». Руская версія кнігі пакуль не ўбачыла свету.




*Жыбур*

Удзельнікі Беларускага кангрэса ў 2017 годзе, у тым ліку прадстаўнікі нашчадкаў Ігнацыя Дамейкі з Чылі, Злучаных Штатаў і Аўстраліі, наведалі месцы, звязаныя з яго імем: Малую Мядзвядку — месца нараджэння Дамейка; Жыбуртаўшчыну (Жыбур), дзе ён правёў частку дзяцінства і пражыў некалькі сваіх апошніх гадоў з дачкой Ганнай і яе мужам; Заполле — маёнтак, якім ён валодаў і ў якім заставаўся пад наглядам паліцыі з 1824 па 1829 гады, а ў 1830 годзе пакінуў яго, каб далучыцца да Лістападаўскага паўстання.

Трэба аддаць належнае тым, хто ў Беларусі, Літве і не толькі напярэдадні юбілею зрабіў шматлікія грунтоўныя даследаванні жыцця і спадчыны Ігнацыя Дамейкі.

Трыўмфальнае шэсце героя па роднай зямлі працягваецца.

# Філамацкае братэрства

Малады шляхціц, лепшы з выпускнікоў Шчучынскай піярскай школы і Віленскага ўніверсітэта, які воляй лёсу стаў выгнанцам, паспяхова працягвае вучобу ў Парыжы, па кантракце выязджае на працу ў маладую Рэспубліку Чылі, знаходзіць дастойнае прымяненне сваім шматлікім талентам, адтрымлівае ад урада гэтай краіны пачэснае грамадзянства і персанальную пенсію за бескарыслівую самаадданую працу.



*Каркас дома, закладзенага дзядзькам І. Дамейкі ў 1819 годзе ў маёнтку Жыбуртошчычына*

За мяжой існуе меркаванне, быццам Ігнацы Дамейка сфармаваўся як навуковец у Парыжы. З гэтым можна паспрачацца. Прывядзём фрагмент з рукапісу Пас Дамейка:

*«Ігнацы нарадзіўся ў багатай шляхецкай сям'і. Ён усведамляў гэта, і яму не трэба было цешыць сябе амбіцыямі. У жыцці ён не імкнуўся да ўзбагачэння і матэрыяльнага дастатку. У юнацтве ён знайшоў сапраўднае шчасце ў поспеху сваёй інтэлектуальнай дзейнасці і ў прыналежнасці да групы людзей, што падзяляць яго мэты і перакананні, — сапраўдных сяброў. Як яму не хапала сяброўскіх адносінаў, агульных інтарэсаў, сваяцтва душ, якія існавалі паміж філаматаў!*

*Ігнацы ведаў, што, магчыма, ніколі больш не сустрэне нічога падобнага. Ён адчуваў сябе адзінокім, замежнікам, выгнанцам, якія жывуць у далёкай чужой зямлі. Ён зрабіў вялікую працу і атрымліваў задавальненне ад свайго занятку, якое заўсёды лічыў самым высакародным з усіх, — выкладання... У яго заставаўся адзі-адзіны сродак, каб забыцца на смутак і тугу: пагрузіцца ў працу.»*

Прапануем таксама адзін з каментарыяў да рукапісу:

*«І. Лялевель пазнаёміў сваіх студэнтаў з так званай «гістарычнай сістэмай» Зарыяна Даленга-Хадакоўскага, якая натхніла, у прыватнасці, філаматаў Міхала Рукевіча і Францішака Малеўскага напісаць і таемна надрукаваць «Інструкцыю для складання апісання N-скага прыходу N-скага павета N-скай губерніі», якой карысталіся філаматы ў родных месцах падчас вакацый.*
*З. Даленга-Хадакоўскі заклікаў прымяняць комплексны падыход у гістарычных даследаваннях, выкарыстоўваючы, акрамя летапісных вестак, дадзеныя археалогіі, этнаграфіі, фальклярыстыкі, тапанімікі. Абавязковым складнікам вывучэння гісторыі ён лічыў падарожжа.*
*І. Ляляевель вучыў студэнтаў распаўсюджваць «гістарычную сістэму» на гісторыю ўласнага народу і ўсеагульную гісторыю, сцвярджаючы, што «нельга трактаваць гісторыю ні аднаго кутка Еўропы без ведання яе ўсеагульнай гісторыі, без звароту да яе».*
*Раскіданыя па розных кутках свету філаматы мелі трывалую базу, закладзеную Віленскім універсітэтам, і паспяхова ўжывалі свае даследчыя навыкі ў новых умовах, распаўсюджваючы іх на іншыя вобласці ведаў».*

Дзякуючы асновам, закладзеным маці і сям'ёй Ігнацыя ў цэлым, Шчучынскай піярскай школай і Віленскім універсітэтам, парыжскія ўніверсітэты ляглі на добрую глебу, і Ігнацы Дамейка заняў годнае месца ў гісторыі навукі і культуры Беларусі, Літвы, Польшчы і Чылі.




*Калекцыя мінералаў Беларусі і Чылі ў школьным музеі г.Мір*

Новы ўласнік Жыбура збіраецца рэканструяваць дом, які сёння практычна разбураны, і аднавіць прыгожыя калісьці сады, наколькі гэта магчыма, каб іх маглі наведваць нашчадкі і прыхільнікі шматлікіх талентаў Ігнацыя Дамейкі. Безумоўна, уладальнікі Жыбура маюць патрэбу ў нашай неадкладнай дапамозе, паколькі ўжо ў наступным годзе дому споўніцца роўна 200 гадоў.

Аўтарцы кнігі ў гэтым годзе споўніўся 81 год, і яна поўная рашучасці і далей прыкладаць усе намаганні для ўшанавання памяці свайго слаўнага продка.

Як жа ж не хапае нам у нашай справе тагачаснага — філаматцкага — братэрства!

## Чацвёра адважных

У беларускай сталіцы госці наведалі Нацыянальную бібліятэку, прайшлі па вуліцы Ігнацыя Дамейкі, агледзелі гістарычную частку горада, сустрэліся з членамі Усебеларускага клуба сяброў Чылі, прынялі ўдзел у падвядзенні вынікаў візіту за Круглым сталом у Нацыянальнай бібліятэцы, правялі каля трох гадзін у Музеі Вялікай Айчыннай вайны, наведалі выставу «Авангард. XXвек» у галерэі Libra, Круглую плошчу.



*Пас Дамейка на фоне вуліцы імя Дамейкі*

Два дні нашчадкі Ігнацыя Дамейкі гасцявалі на Наваградчыне, дзе бралі ўдзел у Першым фестывалі Адама Міцкевіча, прымеркаваным да 220-годдзя паэта, а таксама наведалі месцы, звязаныя з імем свайго знакамітага продка. У Доме-музеі геніяльнага паэта Джэймс іграў на раялі: практычна праз 200 гадоў пасля сустрэчы двух лепшых студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, сябраў філамацскага братэрства!




*На выставе жывапісу Сальвадора Далі*

Па вяртанні ў сталіцу госці азнаёміліся з экспазіцыямі Нацыянальнага мастацкага музея, дзе Джэймсу даставілі задавальненне дакрануцца да клавіш чырвонага раяля, па вартасці ацэненага музыкай.



*Аднойчы праз 200 гадоў...*

У касцёле Святых Сымона і Алены ксёндз Уладзіслаў Завальнюк адслужыў у гонар Ігнацыя Дамейкі Св. Імшу і запрасіў нашчадкаў нашага земляка на прыватную гутарку, дзе гаворка ішла пра рэчы самыя мірныя, але галоўнае — пра тое, што робіцца і што яшчэ трэба зрабіць для прылічэння Ігнацыя Дамейкі да Ліку Святых.



Заключным акордам візіту стаў канцэрт у Доме Ваньковічаў з удзелам ансамбля салістаў «Вытокі» пад кіраўніцтвам Аляксея Фралова і ансамбля старадаўняй музыкі "Brevis". Джэймс Дамейка прадставіў на суд слухачоў імправізацыі і музычную п'есу, якая навеяна наведваннем малой радзімы яго прапрапрадзеда, — Мядзвядкі і Жыбура, хоць аўстралійцаў уразілі таксама Мірскі замак і возера Свіцязь.



*Фундамент дома сямейства Дамейка ў в. Малая Медвядка*

Спадарыня Пас даўно марыла пазнаёміць з Беларуссю малодшае пакаленне свайго шляхетнага роду. Усе пяць яе дачок былі мадэлямі, і калі ў маладосці ўсе шасцёра выходзілі на вуліцы Сіднэя, людзі азіраліся на іх трыўмфальнае шэсце, рызыкуючы зламаць сабе шыі. Хацелася б убачыць хоць бы раз усіх Дамеяк адразу на вуліцах Мінска!



Нашчадкі Ігнацыя Дамейкі карыстаюцца ў нас усенароднай любоўю не толькі дзякуючы свайму знакамітаму продку: кожны з іх годна прадстаўляе свой род. Спадарыня Пас бязмерна любіць сваіх трох унукаў і трох унучак. У гэтай паездцы ў промнях славы няспынна купаўся яе старэйшы ўнук, Джэймс. У сярэдзіне лістапада ён выконвае на англійскай мове галоўную ролю ў спектаклі «Сальвадор Далі» ў складзе польскага тэатра.



*Джэймс Дамейка ў аддзеле рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Амбасада Польшчы ў Аўстраліі ўпарта шукала акцёра — хай нават не з польскімі каранямі — і зусім выпадкова натрапіла на Джэймса, які падключыўся да напісання сцэнарыя і злажыў для пастаноўкі музыку.

Беларуская прэса больш піша пра Джэймса, чым пра Ніка, паколькі яго канёк — гісторыя, а сам ён, у адрозненне ад Джэймса, інтраверт. Аднак Нік асвятляе ў адной з сталічных газет турыстычны бізнес і лічыць, што яго абавязак — зрабіць Беларусь папулярнай у аўстралійскіх турыстаў.



*Нікалас ля камяня ў падмурку  дома дзядзі І. Дамейка*

# Некалькі слоў пра лёс нашчадкаў Ігнацыя

Сын Эрна застаўся жыць у доме ў бацькі, дзе ў яго была капэла. Ён быў улюбёным і паважаным святаром аж да самай смерці ў 1931 годзе.

Аніта і Леон вярнуліся ў Літву ў канцы 1889-га і больш у Чылі не вярталіся. У 1917 годзе з прыходам да ўлады бальшавікоў яны беглі ў Варшаву. Леон памёр неўзабаве пасля пераезду. Не прымусіла сябе доўга чакаць і Аніта. Абодва пахаваныя на Кухарскіх могілках у Варшаве.

Казімір ажаніўся з дачкой Хасэ Эрмахенеса Аламаса, з якім Ігнацы сябраваў практычна ўсё жыццё. Паводле завяшчання Ігнацыя Дамейка, дом стаў сямейным ачагом Казіміра, і многія з яго ўнукаў нарадзіліся тут.

Чылійскі ўрад абвясціў дом Ігнацыя Дамейка Нацыянальным помнікам, пакінуўшы за братамі Дамейка права бесперашкодна прыходзіць сюды. Сёння гістарычны будынак знаходзіцца пад абаронай дзяржавы, і больш няма пагрозы таго, што якая-небудзь будаўнічая кампанія прыбярэ яго да рук і разбурыць, каб пабудаваць новае жыллё. Задоўга да абвяшчэння дома помнікам створаная братамі Карпарацыя Дамейка практычна ператварыла дом у музей, імкнучыся максімальна захаваць памяць аб сваім мудрым продку.

Новыя пакаленні Дамейка працягваюць чылійскую традыцыю ствараць шматдзетныя сем'і. У Ігнацыя, сына Казіміра і Дамінгі, было два сыны і тры дачкі, а ў іх сына Казіміра — чацвёра сыноў; у дачкі Аніты, якой прысвечана англельская версія кнігі, — тры сыны і дачка; у Хуана — тры сыны і дзве дачкі, старэйшая з якіх, Леа-Пас Дамейка, з'яўляецца аўтаркай кнігі.